**А.І.Бабко,** *кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*

# ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ АНТАЛОГІЯ І ЯЕ ЗНАЧЭННЕ Ў БЕЛАРУСКІМ КУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ

Адметнасць беларускай культурнай сітуацыі ў тым, што яна ў найважнейшых сваіх аспектах і сегментах з'яўляецца сітуацыяй выбару. Таму свядомае і дзейснае існаванне ў беларускай культурнай прасторы – справа нялёгкая, бо існаваць у ёй – значыць выбіраць. Да найважнейшых характарыстык фундаментальнай анталогіі М.Хайдэгера належыць яе высокае экзістэнцыяльнае напружанне, і таму яна арганічна стасуецца з экзістэнцыяльнай зараджанасцю беларускай культуры. Гэта азначае, аднак, што фундаментальная анталогія можа і павінна быць эфектыўна задзейнічана ў працэсе аналізу беларускай культурнай сітуацыі. Выявіць некаторыя з магчымых шляхоў такой яе інструменталізацыі і прааналізаваць некаторыя са спроб згаданага задзейнічання, якія рабіліся ўжо на беларускім культурным абсягу, і мае на мэце дадзены артыкул.

Калі засяродзіцца на найважнейшых духоўна-практычных выніках фундаментальна анталагічных даследаванняў М.Хайдэгера, дык іх можна сфармуляваць наступным чынам: чалавек у сваім быцці павінен актуалізаваць уласцівую яму здольнасць выбіраць, ён павінен узняцца да выбару, усвядоміць, што прадметам яго выбару з'яўляецца спосаб існавання ў свеце і што гэты спосаб можа адпавядаць яго існасці або скажаць яе, быць няўласным, няпраўдзівым. Паводле М.Хайдэгера, мы існуем, як правіла, неадэкватна – у модусе, у рамках якога губляецца наша адметнасць, індывідуальнасць. Існаваць на такім узроўні значна лягчэй, чым на ўзроўні, на якім мы здзяйсняем сябе ў самастойнасці і свабодзе. Але да гэтага апошняга нас штурхае покліч сумлення.

Дадзеныя палажэнні з'яўляюцца ў вышэйшай ступені актуальнымі ў беларускім культурным кантэксце. У духоўным жыцці беларускага народа ўдзельная вага звязаных са стратай сваёй самаідэнтычнасці момантаў надзвычай вялікая, і такая сітуацыя заўжды хвалявала беларускіх дзеячаў. Ігнат Абдзіраловіч, напрыклад, даводзіць, што ў фармальным плане "мы павінны згадзіцца, што ў нас неакрэслена культура, што ў нас смутныя гістарычныя шляхі, але ў гэтым няможна бачыць духоўнай беднасці

нашага народа, яго няздольнасці ўласным крокам ісьці да вытварэння ўласных формаў жыцьця” [1, с. 8].

І Ігнат Абдзіраловіч, і мы, яго нашчадкі, шукаем прычыны такога стану спраў. Прыведзеныя вышэй высновы М.Хайдэгера, яго фундаментальная анталогія ўвогуле могуць істотным чынам узбагаціць нашыя пошукі. Мы павінны разумець, што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе аб надзвычай складаным феномене, які мае глыбокую экзістэнцыяльную аснову. Чалавеку (як і народу) уласціва губляць сябе, страчваць сваю саматоеснасць у рамках безасабовага павярхоўнага існавання. Таксама і ў плане нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі гэты феномен мае, як даводзіць М.Хайдэгер, усеагульны, а не лакальны характар: чалавек нярэдка ўцякае ад уласнай нацыянальна-культурнай традыцыі, выбіраючы пры гэтым у вышэйшай ступені вытанчаныя формы (напрыклад, зварот да далёкіх і экзатычных культур) [4, с. 21].

У беларускай культурнай прасторы, аднак, дадзеная з’ява надзвычай пашыраная, што мае свае прычыны, да найістотнейшых сярод якіх належыць выразна выяўлены ў нашай гісторыі трагічны момант. Ён звязаны шмат у чым з геапалітычным становішчам, якое змяшчае ў сабе разам з тым і шмат шанцаў і магчымасцей. Тут заўжды сутыкаліся інтарэсы бакоў, што варагавалі паміж сабой. Тут зводзілі яны паміж сабой рахункі. Кровапралітныя войны стваралі ў беларусаў настрой думак, грунтоўную ролю ў якім адыгрывала пачуццё экзістэнцыяльнага жаху. У сувязі з ім у нашага народа фарміравалася песімістычнае стаўленне да ўласнай будучыні і скептычнае – да сваёй дзейнасці: усялякі даробак і ўсялякі набытак так або інакш будзе знішчаны няўмольнымі абставінамі. Гэты аўтаскепсіс, выцеснены ў сферу бессвядомага, “жыве” ў нас і сёння. У нашых намаганнях, скіраваных на пошук згаданых прычын і шляхоў да пераадолення нацыянальна-культурнай невыразнасці, пашыранай у грамадстве, мы павінны разумець усю складанасць задачы, на што і нацэльвае фундаментальная анталогія.

М.Хайдэгер указвае, што чалавек узнімаецца да сапраўднага існавання ў свеце праз покліч сумлення, у аснове якога ляжаць яго экзістэнцыяльная нікчэмнасць і віна. Філосаф падкрэслівае, што гаворка ідзе тут менавіта аб экзістэнцыяльных, укаранёных у самім быцці чалавека феноменах. Адпаведныя маральныя феномены з’яўляюцца іх праявамі, мадыфікацыямі. Покліч сумлення з усёй выразнасцю гучыць у нашай нацыянальна-культурнай традыцыі. Вялікія дзеячы беларускай культуры даносяць яго да нас з такой

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

сілай, што ён не можа быць непачутым. Але адэкватная рэакцыя на яго – гэта дзеянні, учынкі [4, с. 300]. Ці здолее наш народ узняцца да актыўнай і плённай дзейнасці, настолькі актыўнай і плённай, што яна дазволіць адрадзіць, захаваць і развіць нашу культуру і мову?

Дадзенае пытанне набывае асаблівую вастрыню і актуальнасць у сучасных умовах, калі ва ўсіх сферах грамадскага жыцця з усё большай інтэнсіўнасцю разгортваюцца глабалізацыйныя працэсы. Небяспекі глабалізацыі грунтуюцца найперш на камерцыялізацыі культуры, на ўцягненні яе ў сферу глабальных рынкавых дачыненняў, што функцыянуюць паводле законаў канкурэнцыі, паводле прынцыпаў эканамічнай рацыянальнасці, эфектыўнасці і да т.п. Развіццё інфармацыйных тэхналогій, фарміраванне інфармацыйнага грамадства ствараюць умовы і для фарміравання сусветнага рынку ў сферы культуры. Дзякуючы гэтым новым умовам сярэднестатыстычнаму "спажыўцу" культурных прадуктаў становяцца даступнымі фільмы, песні, відэакліпы і да т. п. самага рознага паходжання. З іншага боку, культурная "індустрыя" імкнецца фарміраваць і задавальняць шырокі попыт на свае прадукты, так што мае месца стандартызацыя "вытворчасці" і "спажывання" культурных прадуктаў. Польскі даследчык Д.Александровіч даводзіць, што гэтая стандартызаваная, моцна амерыканізаваная культура, магутнай стыхіяй якой з'яўляецца электроннапрамянёвая трубка, рухальнай сілай і ўзорам – усеабдымная рэклама, а сімвалічным увасабленнем – Мікі Маўс, ідзе пераможным шэсцем па ўсіх постсацыялістычных краінах [3, с. 8]. Цікава, што Д.Александровіч не бачыць прынцыповых змястоўных адрозненняў паміж гэтай стандартызаванай, універсальнай, амерыканізаванай поп-культурай і традыцыйнай народнай культурай лакальна-нацыянальнага кшталту, так што калі меркаваць бесстароннa, дык у гэтым плане нельга аддаць перавагу адной перад другой. У пэўным сэнсе вышэй стаіць нават першая, паколькі яна спрыяе стварэнню лепшых умоў для паразумення паміж рознымі нацыянальнымі і моўнымі супольнасцямі і для абясшкоджвання "ксенафабічнага патэнцыялу, які маецца ў традыцыйных народных культурах і сілкуецца імі" [3, с. 9]. Д.Александровіч не бачыць, не адчувае, як падаецца, самакаштоўнасці адметнасці, разнастайнасці, непаўторнасці і недаацэньвае духоўны патэнцыял народнай культуры.

Згаданыя небяспекі, аднак, парадаксальным чынам змяшчаюць у сабе істотны станоўчы патэнцыял. У яго адэкватным разуменні, інтэрпрэтацыі і засваенні нам зноў можа істотна дапамагчы фундаментальная анталогія. М.Хайдэгер указвае на вялізнае значэнне экзістэнцыяльнага страху ў плане ўсведамлення чалавекам праўды аб сабе самім, аб сваім быцці ў свеце і ў плане фарміравання рашучасці прыняць і здзейсніць гэтую праўду. Звязаны з небяспекамі глабалізацыі экзістэнцыяльны страх, пачуццё трывогі за сваю будучыню, за будучыню сваёй культуры павінны стаць для беларускага народа мабілізацыйнымі фактарамі, павінны паспрыяць інтэнсіфікацыі яго культурнай дзейнасці, духоўнай працы, творчасці. Беларуская культура, як і іншыя нацыянальныя культуры, ставіцца праз глабалізацыйныя працэсы ва ўмовы, у якіх яны павінны раскрыць свой незадзейнічаны яшчэ патэнцыял, дзеля таго каб “выжыць” і паспяхова развівацца.

Неабходна таксама адзначыць, што ідэі, прадстаўленыя ў рамках фундаментальнай анталогіі М.Хайдэгера, выступаюць як надзвычай запатрабаваныя ў рамках моўнага дыскурсу, што разгортваецца ў беларускай культурнай прасторы [2, с. 16–17]. Калі мова ўвогуле з’яўляецца спосабам быцця, спосабам самаздзяйснення чалавека і нацыі, дык неабходна прыкласці ўсе намаганні дзеля захавання і развіцця нашай мовы як нашага адметнага спосабу быцця ў свеце. Прычым патрэбны менавіта канкрэтныя справы, мы не маем права на ўздыханні, кшталту “самая мілагучная” і да т.п. Мы павінны ўсведамляць, што ў нашай мове сапраўды шмат лакун і недапрацовак, бо яна вельмі доўга ігнаравалася. Таму неабходна працаваць, неабходна пісаць кніжкі і ствараць падручнікі, перакладаць філасофскія, мастацкія і навуковыя тэксты, распрацоўваць праграмы і рабіць гэта якасна. Дзякуючы намаганням тых, хто жыў і пісаў на нашай мове, ёсць беларускамоўная традыцыя як факт сусветнай культуры. Таму яна неўміручая. Але ці не будзе мова ўсяго толькі аб’ектам інтэрпрэтацыі прадстаўнікоў іншых культур, ці знойдзе яна сілы для самаразвіцця ва ўмовах глабалізацыі, – гэта залежыць менавіта ад нас, ад тых, хто працуе ў гэтай традыцыі.

Такім чынам, фундаментальная анталогія М.Хайдэгера дазваляе нам усвядоміць істотныя характарыстыкі беларускай культурнай сітуацыі, выявіць яе глыбокія экзістэнцыяльныя аспекты, зразумець сутнасць праблем, якія неабходна вырашыць на шляху да

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дасягнення сапраўднага, “найуласнейшага” быцця нашага народа ў складаным, супярэчлівым, глабалізаваным свеце.

---

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І.Абдзіраловіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Рудкоўскі, П.* Нацыянальны дыскурс і ліберальны мардабой. Пасляслоўе да дыскусіі пра мову “Нямецкай хвалі” / П.Рудкоўскі. – Arche. Пачатак. – 2005. – № 5. – С. 5–20.

3. *Aleksandrowicz, D.* Kulturelle Kosten der Transformation / D.Aleksandrowicz. – Frankfurter Institut für Transformationsstudien. Arbeitsberichte. – № 3. – 1998. – 16 S.

4. *Heidegger, M.* Sein und Zeit / M.Heidegger. – Tübingen: Niemeyer, 1993. – 445 S.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ